СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 4 (735) | Субота, 15 студзеня | 1944 г.

У раёне Кіравагрда за час баёў з 5 студзеня па 8 студзеня ўключна нашымі войскамі знішчана: 233 нямецкіх танкі, 296 розных гармат, 40 самаходных гармат, 121 мінамёт, 415 кулямётаў, 94 бронемашыны, 978 аўтамашын.

Забіта звыш 15 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

Нашы войскі захапілі трафеі: 150 танкаў, 188 гармат, 242 мінамёты, 429 кулямётаў, 25 бронемашын і бронетранспарцёраў, 2.009 аўтамашын, 19 складаў праціўніка.

## Павялічваць баявы рахунак

У навагодняй прамове на 1944 год таварыш КАЛІНІН сказаў: „Вернымі памочнікамі Чырвонай Арміі з'яўляюцца нашы слаўныя партызаны і партызанкі. Яны робяць вялікую справу, бязлітасна знішчаючы ворага“.

Народныя мсціўцы нашага раёна ўжо зрабілі многа па знішчэнню ворага і яго тэхнікі, ужо не адзін дзесятак эшалонаў, не адна сотня машын узляцелі ў паветра і не адна тысяча гітлераўцаў знайшла магілу ад партызанскіх куль. Наш народ будзе весці бязлітасную барацьбу пакуль хоць адзін жывы немец астанецца на нашай зямлі.

Партызаны і партызанкі, дапамагайце фронту скарэй вызваліць нашу зямлю ад чужынцаў, не прапускайце эшалонаў і машын да лініі фронта, знішчайце сувязь і жывую сілу праціўніка. Бярыце прыклад з патрыёта Радзімы васемнаццацігадовага Міхаіла П., які асабіста пусціў пад адхос 8 нямецкіх эшалонаў, узарваў многа машын ворага і знішчыў дзесяткі фрыцаў, а такіх прыкладаў многа.

Задача кожнага патрыёта Радзімы—днём і ноччу праследаваць ворага, няхай гарыць зямля пад нагамі акупантаў, кожны павінен забіць немца, а калі не забіў—знайдзі яго і забі, каб не сорамна было сустрэцца з воінамі Чырвонай Арміі і сказаць: „Дарагія доўгачаканыя браты! Я таксама дапамог вам у барацьбе,—я забіў немца“!

Таварышы партызаны і партызанкі—усе на бязлітасную барацьбу з акупантамі, за большы лік забітых немцаў!

## У СОЎНАРКОМЕ САЮЗА ССР

## Аб новым Дзяржаўным гімне Савецкага Саюза

У віду таго, што сучасны Дзяржаўны гімн Савецкага Саюза „Інтэрнацыянал“ па свайму зместу не адлюстроўвае карэнных змен, адбыўшыхся ў нашай краіне ў рэзультаце перамогі Савецкага строя і не выражае сацыялістычнай сутнасці Савецкай Дзяржавы,—Совет Народных Камісараў Саюза ССР рашыў замяніць тэкст Дзяржаўнага гімна новым тэкстам, адпавядаючым па свайму зместу духу і сутнасці Савецкага строя.

Зацверджан наступны тэкст новага Дзяржаўнага гімна:

### Гимн Советского Союза

(текст Сергея Михалкова и Эль-Регистана)

Союз нерушимый Республик свободных
Сплотила на-веки Великая Русь.
Да здравствует созданный волей народов
Единый, могучий Советский Союз!
Славься, Отечество наше свободное,
Дружбы народов надежный оплот!
Знамя Советское, знамя народное
Пусть от победы к победе ведет!
Сквозь грозы сияло нам солнце свободы,
И ЛЕНИН великий нам путь озарил.
Нас вырастил СТАЛИН—на верность народу,
На труд и на подвиги нас вдохновил.
Славься, Отечество наше свободное,
Счастья народов надежный оплот!
Знамя Советское, знамя народное
Пусть от победы к победе ведет!
Мы армию нашу растили в сражениях,
Захватчиков подлых с дороги сметем!
Мы в битвах решаем судьбу поколений,
Мы к славе Отчизну свою поведем!
Славься, Отечество наше свободное,
Славы народов надежный оплот!
Знамя Советское, знамя народное
Пусть от победы к победе ведет!

Для новага Дзяржаўнага гімна прынята музыка кампазітара Александрава А. В.

Ноты да музыкі гімна будуць апублікованы асобна.

Паўсямеснае выкананне новага Дзяржаўнага гімна ўводзіцца з 15 сакавіка 1944 года.

## ПА САВЕЦКАМУ САЮЗУ

У Касцюковіцкай МТС (Магілёўская вобласць) аднаўляюцца трактары і машыны. Ужо адрамантавана 22 трактарных плугі, 1 малатарня і 8 трактароў.

КОЛЬКІ ТЫ ЗАБІЎ НЕМЦАЎ?

## Скромнасць Мішы і яго баявыя справы

18-гадовы юнак Міша П. аб сваіх баявых справах не любіць гаварыць. І калі трэба даведацца пра што-небудзь з яго баявых дзенняў, патрэбна папытацца ў каго-небудзь з яго таварышоў, якія паважаюць свайго бесстрашнага баявога друга за тое, што Міша ўсімі сіламі душы ненавідзіць праклятых чужынцаў, за яго адважнае камсамольскае сэрца, за цёплую дружбу, за скромнасць.

Міша прышоў у атрад у кастрычніку 1942 года і адразу-ж завалваў аўтарытэт сярод партызан. Ён з'яўляецца ініцыятарам многіх баявых аперацый. На чыгунцы ён асабіста ўстроіў крушэнні 8 нямецкіх воінскіх эшалонаў, узарваў 22 рэльсы. На шасэйнай дарозе С.—Б. ён знішчыў 2.500 метраў сувязі праціўніка, спаліў 8 мастоў на шляхах ворага. Забіў 4 немцаў і аднаго паліцая, з якімі сустрэўся тварам да твару, не лічачы тых, якія забіты пры крушэннях, у баях і другіх баявых аперацыях. Міша 6 разоў удзельнічаў у баях супроць карных экспедыцый немцаў.

БАРЫС Н.

## Баявы рахунак нашай групы

З вялікай радасцю я пайшоў у партызанскі атрад знішчаць ненавісных ворагаў беларускага народа—немцаў, за гэты час удзельнічаў у многіх баях з гітлераўцамі.

Я з'яўляюся ўдзельнікам асавецкага бою, у якім забіта больш 70 фрыцаў і многа паранена, спалена 3 мастоў на важных камунікацыях праціўніка і разрушэння чыгуначнага палатна.

Добра валодаючы падрыўной справай я разам з другімі партызанамі падарваў на мінах 4 аўтамашыны, 3 павозкі, матацыкл і з засад разбіў 2 аўтамашыны праціўніка.

Зараз разам са сваёй групай маю на рахунку 66 забітых немцаў. Як відаць, лік немалы. Але на ім не спынюся. Буду біць праклятых гітлераўцаў, пакуль хоць адзін з іх будзе на нашай зямлі.

КАСЦЯН,
партызан энскага атрада.

## Александр забіў немца

Марозная ноч. Злегка падувае паўночны вецер. Шырокае палатно шасэйнай дарогі перасякае вясковыя палеткі. Шуміць у далі лес. Група партызан атрада імя С. ішла на баявое заданне.

Група народных мсціўцаў прыбліжаецца да энскай вёскі, зоркае вока партызана Александра М. заўважае за вуглом хаты фігуру. Александр аклікнуў „хто ідзе“ і агідны немец як воўк крыкнуў „дойч пост“.

Хвіліна, і, як падрубленае дрэва, валіцца на снег фігура фрыца, а вінтоўка ўжо аказалася ў руках Александра і група працягвала рухацца па сваіму шляху.

МІХАІЛ Б.

## Следуйце майму прыкладу

Служыць у паліцыі і выступаць супроць свайго народу мне не хацелася. Я разам з двумя таварышамі, таксама гвалтоўна ўзятымі на службу ў паліцыю, ўзяўшы з сабою 6 вінтовак, ушоў у партызаны.

Цяпер разам з другімі народнымі мсціўцамі б'ю і знішчаю немцаў і іх тэхніку. На маім рахунку—спушчаны пад адкос 2 нямецкіх эшалоны. Падарвана 32 рэльсы. Забіта і паранена 30 немцаў.

ФЕДАР ЛЫСЕНКА,
партызан атрада імя О.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 10 ПА 15 СТУДЗЕНЯ)

Войскі Беларускага фронта пад камандаваннем генерала арміі Ракасоўскага перайшлі ў наступленне, прарвалі абарону немцаў і ў выніку смелага абходнага манеўра 14 студзеня авалодалі абласным цэнтрам Беларускай ССР горадам МОЗЫР, горадам і вялікім чыгуначным вузлом КАЛІНКАВІЧЫ, а таксама занялі 110 другіх населеных пунктаў.

Войскі 1-га Украінскага фронта, фарсіравалі раку Случ і 11 студзеня штурмам авалодалі горадам Сарны—крупным чыгуначным вузлом і важным апорным пунктам абароны немцаў на Палескім напрамку і занялі да 100 другіх населеных пунктаў, сярод якіх раённыя цэнтры Ровенскай вобласці Дамбравіца, Берэзно, Людвіпаль, раённы цэнтр Жытомірскай вобласці Любар, раённыя цэнтры Вініцкай вобласці Варанавіца і Неміраў, раённы цэнтр Кіеўскай вобласці Манькоўка.

Заходней і паўднёва-заходней Сарны і Новаград-Валынскі нашы войскі занялі 140 населеных пунктаў, у тым ліку раённыя цэнтры Ровенскай вобласці Карэц і Сцепань, раённы цэнтр Каменец-Падольскай вобласці Берэздаў.

Нашы войскі паўночна-заходней і заходней Кіраваград працягвалі наступленне і авалодалі райцэнтрам Кіраваградскай вобласці Каменка-Шэўчэнкоўская, а таксама з баямі занялі звыш 50 другіх населеных пунктаў.

Паўднёвей Вініцы нашы войскі паспяхова адбівалі атакі крупных сіл пяхоты і танкаў праціўніка і нанеслі яму вялікія страты.

На другіх франтах—арт-мінамётная перастрэлка і баі мясцовага значэння.

За 5 дзён баёў падбіта і знішчана 489 нямецкіх танкаў і збіта 275 самалётаў праціўніка.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б Друкарня газеты „Сталінец“